«**Дрэннага** пра службу не ўспамінаецца» / падрыхт. А. Бурэц // Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). — 2012. — 15 лют. — С. 2.

**«ДРЭННАГА ПРА СЛУЖБУ НЕ ЎСПАМІНАЕЦЦА»**

У раённай газеце мы пастаянна расказваем пра нашых землякоў, чые лёсы аказаліся звязаныя з далёкім Афганістанам. Гэтым разам сустрэліся і пагаварылі з Ігарам Дзмітрыевічам Пятровым. Нарадзіўся ён у Смаленскай вобласці, пазней яго бацькі пераехалі ў Шаркаўшчыну. У 1935 годзе закончыў школу, а ў 1986-м яго прызвалі ў армію. Служыць выпала ў пагранічных вайсках. Чатыры месяцы «вучэбкі» ў Туркменіі, пасля чаго іх перакінулі ў суседні Афганістан – ахоўваць той бок мяжы ад душманаў. Знаходзіліся яны там фактычна на нелегальным становішчы. За іх манеўранай групай быў замацаваны ўчастак памерам 200 кіламетраў паблізу ад горада Мейменэ. Яны патрулявалі яго, суправаджалі праходзячыя праз гэту тэрыторыю калоны, забяспечваючы іх бяспеку, і самі пастаянна знаходзіліся пад небяспекай душманаўскіх абстрэлаў з гор. Знаходжанне ў баявых умовах стала для маладога хлопца сапраўдным урокам мужнасці, загартоўкай, якая спатрэбілася ў наступным жыцці.

– Ведаеце, – расказвае ён, – нічога дрэннага пра часы службы мне не ўспамінаецца. Мне нават здаецца, што служыць на тым баку было лягчэй, чым тут, у Саюзе. Там кожны чалавек быў як на далоні, у такіх напружаных умовах кожны адразу праяўляў сябе. Дрэнныя доўга ў нас не затрымліваліся, іх стараліся адправіць назад, бо там, дзе размова ідзе пра жыццё і смерць, трэба, каб ты мог быць цвёрда упэўнены ў сваім таварышы. Падчас самой службы асаблівага страху не было, а вось перад «дэмбелем» з'явіўся мандраж ад разумення, што вось можаш недайсці да яго.

Але даслужыць да канца Ігару не давялося: лёс нанёс удар з тылу – з дому прыйшла вестка пра смерць маці. У сувязі з гэтым Ігара дэмабілізавалі крыху раней за яго прызыў. Але праведзеныя паўтара года ў далёкай чужой краіне засталіся назаўсёды ў памяці шаркаўчаніна: нязвыклае надвор'е, калі дзённая спёка змянялася марознымі халоднымі начамі, цвёрдая, скалелая ад пастаянных перападаў тэмпературы афганская зямля і заснежаныя вяршыні гор, якія бялелі ўдалечыні нават у спякотныя летнія дні.

Вось ужо 5 гадоў Ігар працуе ў аддзяленні Дэпартамента аховы. З жонкай Наталляй яны вырасцілі дачку Надзею, якая цяпер працуе ў Наваполацку ў бальніцы. Пра афганскі перыяд у сваім жыцці ўзгадваць даводзіцца ў час памятных дат, калі шаркаўшчынскія афганцы збіраюцца разам.

– Адчуванне армейскага братэрства, узаемавыручкі застаецца ў нас і цяпер, пастаянна знаходзімся на сувязі, падтрымліваем адзін аднаго ў горы, дзелім радасць, – гаворыць Ігар. – Вельмі спадабалася, калі мінулым летам у Шаркаўшчыне ў скверы ДРБУ-131 адкрывалі памятны знак воінам-інтэрнацыяналістам, кранула атмасфера і праяўленая да нас павага. А ў гэты асаблівы для нас дзень найперш хочацца пажадаць усім тым, хто прайшоў Афган, здароўя. Што ні гавары, а праведзены там час пакінуў свой след. Таму самае галоўнае, канешне, каб было здароўе. А так мы – хлопцы дружныя, баявыя, і ўсё астатняе і самі ў жыцці дасягнём і абаронім.

**Матэрыялы А. Бурца**